26. РДГА. – Фонд 1350. – Воп. 312. – Спр. 89. – Л. 12-125; НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 4. – 14-15; НГАБ у Гродне. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 115. – Л. 2-14.
27. НГАБ. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 15. – Л. 18 адв.
28. Там жа. – Л. 18 адв. – 19.
29. Там жа. Спр. 13. – Л. 9.
30. Там жа. – Спр. 12. – Л. 20.
31. Там жа. – Фонд 149. – Воп. 2. – Спр. 778. – Л. 1.
32. Там жа. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 11. – Л. 1-9.
33. РДГА. – Фонд 1350. – Воп. 312. – Спр. 89. – Л. 4 адв.; Спр. 90. – Л. 12-125; НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 3. – Л. 6; Спр. 4. – Л. 14-15; НГАБ у Гродне. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 115. – Л. 2-14.
34. НГАБ. – Фонд 24. – Воп. 1. – Спр. 52. – Л. 14-23; Спр. 53. – Л. 14-36; Фонд 1430. – Воп. 1. Спр. 1954. –Т. 2. – С. 190; Спр. 3203. – Л. 17 адв. – 18; НГАБ у Гродне. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 115.
35. НГАБ. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 6-15, 22 і інш.
36. Там жа. – Спр. 22. – Л. 7.
37. НГАБ у Гродне. – Фонд 1. – Воп. 3. – Спр. 422. – Л. 137.
38. НГАБ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 1684. – Л. 168.
39. НГАБ у Гродне. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 296. – Л. 8-135.
40. Там жа. – Воп. 3. – Спр. 422. – Л 137.
41. Полный сборник законов Российской империи (ПСЗ). – Т. 37. – № 26171.
42. Чепко, В.В. Города Белоруссии в первой половине XIX в.: Экономическое развитие / В.В. Чепко. – Минск, 1981.
43. Бобровский, П. Материалы для географии и статистики России: Гродненская губерния / П. Бобровский. – СПб., 1863. – Т. 2.
44. РДГА – Фонд 1350. – Воп. 312. – Спр. 90. – Л. 14.
45. НГАБ – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 1684. – Л. 147.
46. Там жа. – Спр. 10324. – Л. 243.
47. Болбас, М.Ф. Указ. тв.
48. Там жа; Чепко, В.В. Указ. тв.
49. Болбас, М.Ф. Указ. тв.
50. Маркс, К. Указ. тв. – Т. 23; Ленин, В.И. Указ. тв. – Т. 2; 3
51. Ленин, В.И. Указ. тв. – Т. 3.
52. Там жа. – Т. 2.
53. Там жа.
54. Маркс, К. Указ. тв. – Т. 23.
55. Там жа.
56. Ленин, В.И. Указ. тв. – Т. 3.


## Інтэлігенцыя гарадоў Беларусі і яе ўплыў на развіццё культуры ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

*В. Б. Казакевіч*

Адным з важнейшых фактараў, уплываўшых на культурнае развіццё гарадоў Беларусі, з'яўляўся абсалютны і адносны рост гарадскога насельніцтва ў парэформенныя дзесяцігоддзі. З 1861 па 1892 г. насельніцтва беларускіх гарадоў узрасло амаль у 2,2 разы і склала 961,8 тыс. чалавек [6, с. 731]. Рост колькасці гарадскога насельніцтва суправаджаўся ўскладненнем сацыяльнай структуры беларускіх гарадоў, важнейшым звяном якой было фарміраванне інтэлігенцыі. Колькасныя і якасныя змены ў складзе інтэлігенцыі Беларусі даследаваны ў пэўнай ступені беларускімі гісторыкамі [9; 8].

Інтэлігенцыя Беларусі, выступаўшая ідэйным кіраўніком культурна-асветніцкага і адраджэнчаскага руху ў Беларусі, уяўляла сабой адукаваную частку насельніцтва. З агульнай яе колькасці ў канцы XIX ст універсітэт скончылі 8,0%, спецыяльныя тэхнічныя ВНУ – 2,2%, ваенныя ВНУ – 0,6%, сярэднія



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дныя навучальныя ўстановы – 9,9%, сярэднія спецыяльныя ўстановы – 9,3%, розныя тыпы агульнаадукацыйных школ – 7,0% [ 8, с. 14 ]. Гэты адукаваны слой насельніцтва не толькі ўплываў на навукова-тэхнічны прагрэс капіталістычнага развіцця, але і паступова стаў вызначаць узровень і характар духоўнага і культурнага развіцця краю. Вызначальную ролю ў гэтым працэсе адыгрывала гарадская інтэлігенцыя, адукацыйны ўзровень якой быў значна вышэйшы, чым інтэлігенцыі ў цэлым.

Безумоўна, уплыў інтэлігенцыі Беларусі на стан і ўзровень культурнага развіцця грамадства ў значнай ступені залежыў ад яе канцэнтрацыі ў гарадах, якія на той час вызначалі сацыяльна-эканамічны і культурны прагрэс краю. Згодна ўсеагульнаму перапісу Расійскай імперыі 1897 г., інтэлігенцкая частка насельніцтва Беларусі ў 1897 г. налічвала прыкладна 54 360 чалавек, 45,0% з якой пражывала ў губернскіх і павятовых гарадах [ 8,с. 4 ]. Высокай ступенню канцэнтрацыі інтэлігенцыі ў канцы XIX ст. вызначаліся гарады Віцебскай губерні, дзе ў 1897 г. было засяроджана 52,0% усяго яе насельніцтва занятага інтэлектуальнай дзейнасцю, а ў гарадах Гродзенскай і Віленскай губерняў, гэты паказчык складаў адпаведна 49,0% і 48,0%. Удзельная вага насельніцтва інтэлектуальнай дзейнасці была значна ніжэйшай ў гарадах Мінскай і Магілёўскай губерняў і адпаведна складала 40,0% і 37,0% [ 9, с. 264 ].

Такім чынам, аналіз перапісу 1897 г. сведчыць, што колькасць работнікаў інтэлектуальнай дзейнасці ў беларускіх гарадах у цэлым не дасягала і 50,0% рубяжа ад агульнага іх ліку. Гэта, безумоўна, з'явілася стрымліваючым фактарам у ўзмацненні ролі гарадоў у эканамічным, сацыяльным і культурным развіцці краю.

Тым не менш, капіталістычнае развіццё і эканамічны ўздым 90-х гадоў, павысіўшы попыт на інтэлектуальную працу, садзейнічалі фарміраванню прафесійнага слою інтэлігенцыі, які ў асноўным канцэнтраваўся ў гарадах. Аналіз статыстычных даных сведчыць што, менавіта, беларускія гарады канцэнтравалі ў канцы XIX ст. 81,0% юрыстаў і навукоўцаў, звыш 50,0% медыцынскіх работнікаў, каля 40,0% настаўнікаў. Святары ў асноўным былі засяроджаны ў сельскай мясцовасці і ў гарадах пражывала ўсяго 23,0% ад агульнай іх колькасці .

Самая вялікая ўдзельная вага прафісійных работнікаў у канцы XIX ст. пражывала ў гарадах Віленскай, Віцебскай і Гродзенскай губерняў. Менавіта ў іх было засяроджана адпаведна 86,0%, 84,0% і 72,0% навуковых работнікаў; 75,0%, 82,0% і 88,0% юрыстаў; 52,0%, 57,0% і 53,0% медыцынскіх работнікаў. Гарады Віцебскай і Гродзенскай губерняў вылучаліся і высокай канцэнтрацыяй настаўніцкіх кадраў удзельная вага якіх адпаведна складала 63,0% і 54,0%, тады як у гарадах Віленскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў гэты паказчык не дасягаў і 50,0%. У Віленскай ён складаў 49,0%, ў Мінскай – 40,0% і ў Магілёўскай – 42,0%. Канцэнтрацыя інтэлігенцыі ў беларускіх гарадах павінна была садзейнічаць узмацненню стасункаў паміж адукаванай часткай грамадства, яе згуртаванню вакол агульных жыццёвых, палітычных і культурных праблем.

Значны ўплыў на культурнае развіццё беларускіх гарадоў і іх уздзеянне на духоўны стан краю аказваў і нацыянальны склад інтэлігенцыі, які характарызаваўся стракатасцю і шырокай этнічнай разнастайнасцю. Асноўную частку гарадской інтэлігенцыі складалі яўрэі, на долю якіх прыходзілася 40,0%, удзельная вага рускіх складала 22,3%, а доля палякаў вызначалася 8,6%. Што тычыцца колькасці беларусаў сярод гараджан, занятых інтэлектуальнай працай, то яна была нязначнай і складала ў 1897 г. усяго 7,1%. Асабліва нізкай удзельная вага беларусаў была сярод інтэлектуальнай часткі гараджан Віленскай губерні

(3,6%) і Гродзенскай ( 3,8%), менавіта, тых рэгіёнаў, якія гістарычна знаходзіліся пад культурным рэлігійным уплывам Захаду.

Дастаткова нізкім працэнт беларусаў сярод інтэлектуалаў пяці заходніх губерняў быў у гарадах Віцебскай і Мінскай губерняў, дзе ён складаў адпаведна 8,1% і 5,8%. У гарадах Магілёўскай губерні, якая вызначалася геаграфічнай блізасцю да Расіі і дзе быў моцны ўплыў усходняй культуры і праваслаўнай рэлігіі, удзельная вага беларусаў сярод інтэлектуалаў была некалькі вышэйшай і складала 9,7%. Нязначнай была ўдзельная вага беларусаў і сярод гарадской інтэлігенцыі пэўнай прафесіі. Сярод медыцынскіх работнікаў беларусы ў 1897 г. складалі 11,2%, сярод юрыстаў – 6,1%, навуковых работнікаў – 4,4%, сярод настаўнікаў – 4,3% [ 9, с. 264, 265 ].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Такім чынам, аналіз статыстычнага матэрыялу сведчыць, што інтэлігенцыя ў гарадах, па свайму нацыянальнаму складу была іншаэтнічнай карэннай тытульнай нацыі і гэта адмоўна адбівалася на фарміраванні самой беларускай нацыі, развіцці беларускай мовы і нацыянальнай культуры. Гэтыя абставіны высвятляюць нераўнапраў'е беларускай нацыі ў культурным жыцці Беларусі, што ў многім вызначалася і яе нераўнапраўным эканамічным становішчам ва ўмовах капіталістычнага развіцця, калі асноўныя капіталы краю знаходзіліся ў руках польскіх і рускіх памешчыкаў, яўрэйскіх купцоў і прамыслоўцаў.

Такая нізкая ўдзельная вага беларусаў сярод інтэлігенцыі Беларусі і яе інтэлектуальнай часткі ў гарадах можа тлумачыцца шэрагам фактараў, адным з якіх з'яўляецца страта пераемнасці паміж рознымі яе пакаленнямі ў выніку жорсткага падаўлення паўстання 1863-1864 гг. і »разбора» шляхты, утворанага царскім урадам. Многія прадстаўнікі нацыянальнай інтэлігенцыі пад уплывам канкрэтна-гістарычных абставін прытрымліваліся афіцыйнага погляду на прыналежнасць беларусаў да адзінага рускага народа, другія адносілі сябе да польскага насельніцтва. У пачуццях беларускай інтэлігенцыі змагаліся польская самасвядомасць і ідэі «заходнярусізма», згодна якім беларусы лічыліся адной з этнаграфічных груп рускага народа. І хаця пэўная частка краёвай інтэлігенцыі, станаўленне якой у гісторыі Беларусі адбывалася пад уздзеяннем заходняга і ўсходняга цывілізацыйных ўплываў, нават ў пачатку XX ст. не ўсведамляла ў поўнай меры нацыянальных ідэй, аднак у яе складзе адбыліся значныя станоўчыя колькасныя і якасныя змены.

Аналіз статыстычных даных дазваляе выявіць пэўныя адрозненні ў засяроджванні беларускай інтэлігенцыі ў гарадах заходніх і ўсходніх рэгіёнаў, якія знаходзіліся пад уплывам розных цывілізацыйных каштоўнасцяў. Найбольш высокай удзельнай вагой беларусаў сярод прафесійнай інтэлігенцыі вылучаліся гарады паўночна-усходніх губерняў – Віцебскай і Магілёўскай, дзе быў моцны расійскі ўплыў. Так, у гарадах Магілёўскай губерні беларусы сярод медыцынскіх работнікаў складалі 26,8%, сярод юрыстаў – 14,2%, настаўнікаў – 8,9%, сярод навукоўцаў – 6,8%, а сярод светароў – 40,1% .

Гэтыя паказчыкі былі ў некалькі разоў ніжэйшымі ў гарадах Віленскай, Гродзенскай губерняў, якія гістарычна знаходзіліся пад польскім уплывам. Так, у гарадах гэтых губерняў беларусаў сярод медыцынскіх работнікаў налічвалася адпаведна – 5,6% і 7,3%, сярод юрыстаў – 0,6% і 5,5%, сярод настаўнікаў –

3,3% і 2,1%, сярод навукоўцаў беларусы складалі 2,4% і 7,8%, а сярод светароў – 3,7% і 4,3%. Тут гарадская інтэлігенцыя папаўнялася ў асноўным коштам каталіцкай шляхты, якая была моцна інтэгрыравана ў асяроддзе польскай культуры. Даволі нізкая ўдзельная вага беларусаў сярод прафесійнай інтэлігенцыі была ў гарадах Мінскай губерні. Дастаткова сказаць, што тут беларусы складалі ўсяго 3,4% сярод настаўнікаў і 4,0% – сярод юрыстаў [ 9, с. 265 ].

І тым не менш, нацыянальная беларуская інтэлігенцыя адыгрывала рашаючую ролю ў аднаўленні і развіцці беларускай нацыянальнай культуры. Яна, ў асноўным, узрастаючы коштам збяднелай шляхты і выхадцамі з сялянскага асяроддзя, хутчэй далучалася да нацыянальных каранёў, вывучала і развівала беларускую мову, звычаі, абрады, выступала ў якасці ідэёлага нацыянальнага адраджэння.

Сярод дэмакратычна настроенай беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі паступова сфарміравалася ўяўленне аб этнічнай самастойнасці беларусаў, аб наяўнасці ўмоў для самастойнага развіцця беларускага краю. Ужо ў 1897 г. да ліку беларусаў ( па роднай мове) далучалі сябе 19, 9% настаўнікаў ( 3 269 з 16 401), 25,8% медыцынскіх работнікаў ( 1 255 з 4 855 ), 9,7% адвакатаў ( 61 з 627), 9,7% дзеячоў літаратуры, мастацтва, навукі ( 96 з 987 ) [ 10, с. 415 ].

Цікавасць нацыянальнай інтэлігенцыі да беларускасці будзіла свядомасць беларусаў, а тэрмін « беларусы «, няхай яшчэ чыста ў этнаграфічным сэнсе, паступова пранікаў у масавую свядомасць. У 1897 г. паводле перапісу насельніцтва ўжо 74,0% жыхароў Паўночнага – Заходняга краю вызначалі свой родны язык, як беларускі. Беларусы (па роднай мове ) ў Магілёўскай губерні складалі 82,4%, у Мінскай – 76,0%, у Віленскай – 56,0%, у Віцебскай – 52,0% і ў Гродзенскай – 44,0%. Аднак, сярод гараджан пяці заходніх губерняў беларусы (па роднай мове ) складалі ў сярэднім толькі 14, 5% і іх доля

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

гарадскім насельніцтве вагалася ад 7,6% у Віцебскай да 30,9% у Магілёўскай губерні [ 5, с. 96-99; 4, с. 80-83; 1, с. 56-59; 2, с. 76-79; 3, с. 104-109; 11, с. 333 ].

Па меры дальнейшага развіцця буржуазнага грамадства працэс фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларускай інтэлігенцыі працягваў паглыбляцца, а яе роля ў гармадска-палітычным жыцці краю ўзрастала. Глыбока і крытычна асэнсоваючы працэсы, якія развіваліся ў беларускім грамадстве ў парэформенныя часы, беларуская інтэлігенцыя імкнулася да нацыянальна-культурнага адраджэння краю, якое ўжо ў пачатку XX ст. уяўляла сабой цэласную нацыянальную праграму ў палітычнай, культурнай і духоўнай сферах жыцця . Асноўнымі цэнтрамі гэтай дзейнасці беларускай інтэлігенцыі, як правіла, станавіліся беларускія гарады, дзе ў большасці былі заасяроджаны навуковыя, адукацыйныя і культурна-асветніцкія ўстановы. Так, у 1904 г. у губернскіх і павятовых гарадах Беларусі функцыянавала 9 тэатраў, 2 цыркі, 2 музеі, працавалі 54 бібліятэкі, 18 чытальняў, 10 бібліятэк-чытальняў [7, с. 297 ].

Інтэлігенцыя выступала не толькі стваральнікам культурных каштоўнасцей, але і галоўным іх карыстальнікам. Дэмакратызацыя культурнага жыцця, тыпічная для парэформеннага часу, знаходзіла сваю праяву ў росце чытачоў мастацкай, а тым больш навуковай літаратуры, газет, журналаў, у павялічэнні ўдзельнай вагі інтэлігенцыі сярод тэатральных гледачоў, наведвальнікаў музеяў і г. д. Адукаваная, кіруючаяся пачуццямі маральнага доўга, дэмакратычна настроенная інтэлігенцыя ідзе служыць у земскія школы, бальніцы, агранамічныя і інш. земскія ўстановы.

Шматгранная культурна-асветніцкая дзейнасць беларускай інтэлігенцыі развівалася ў розных накірунках, важнейшым з якіх быў перыядычны друк і кнігаведавецкая дзейнасць, выдавецкія цэнтры якіх, як правіла, знаходзіліся ў губернскіх і павятовых гарадах. Толькі ў 1904 г. у гарадах Беларусі дзейнічала 75 тыпаграфій, 8 літаграфій і 10 тыпа-літа-графій [ 7, с. 297-298]. У Мінску з 1901 па 1916 г. выходзіла ў свет 62 найменаванні перыядычных выданняў, у Віцебску – 16, у Магілеве – 10, у Гродне -8 [7, с.305-309 ]. Сваю вядучую ролю ў культурным развіцці краю працягвала захоўваць Вільня. На долю віленскай беларускай перыёдыкі прыходзілася 2/3 усіх газет, часопісаў, якія выдаваліся ў Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай і Гродзенскай губернях, а таксама ў самой Вільне . Вызначальную ролю ў адраджэнні беларускай мовы і культуры адыгрывала газета « Наша ніва «, якая выдавалася, і на кірыліцы і на лацініцы, што рабіла яе ўніверсальнай дзеля рознай аўдыторыі.

Менавіта, праз газету « Наша ніва « невялікая група нацыянальна – свядомай інтэлігенцыі імкнулася захаваць для беларускай культурнай традыцыі здабыткі «ліцвінства «, асноўныя духоўныя традыцыі старэйшых пакаленняў. Канчатковы выбар на карысць кірыліцы быў зроблены толькі ў кастрычніку 1912 г.

Невялікая кола беларускай інтэлігенцыі, складаўшай рэдкалегію гэтых выданняў, стала своеасаблівым культурным асяродкам і паступова перарасло ў культурна-адраджэнчаскую плынь, да якой далучалася вялікая колькасць людзей, не меўшых да гэтага часу дачынення да нацыянальна-адраджэнчаскага руху.

На чале гэтага аб'яднаўчага працэсу стаяла рэдкалегія газеты « Наша ніва «, актыўнамі членамі якой з'яўляліся браты І. і А. Луцкевіч, В. Іваноўскі,

А. Уласаў, А. Пашкевіч і іншыя лідэры Беларускай сацыялістычнай грамады. Дзякуючы іх намаганням рос тыраж газеты, павялічвалася колькасць чытачоў, пашыралася геаграфія яе распаўсюджвання. Так, у сакавіку 1907 г. тыраж газеты складаў 1 500 экзэмпляраў, а ў сакавіку 1911 г. – ужо каля 3000 [ 12, с. 237 ]. Галоўную задачу беларускі друк бачыў « у барацьбе за усебаковае нацыянальна-культурнае адраджэнне беларускага народа, за прызнанне самаго факта яго існавання «. Праз беларускі друк, сацыяльнай базай выдання якога быў працоўны народ, і ў першую чаргу сялянства, нацыянальная інтэлігенцыя аказвала вызначальны ўплыў на ўзровень і стан культурнага развіцця краю і асобных рэгіёнаў.

Беларускім гарадам належыла вызначальная роля і ў адукацыйным накірунку. Менавіта, беларускія гарады, у адсутнасці вышэйшых навучальных устаноў, у 1904 г. засяроджвалі 352 сярэдніх і ніжэйшых навучальных ўстаноў, у якіх працавала 1 083 настаўнікаў і навучалася 40 050 вучняў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Найбольшай колькасцю навучальных установ вызначаліся гарады Мінскай губерні, 11 з якіх мелі сярэднія і нізшыя адукацыйныя ўстановы. Лідэрам у гэтым накірунку выступаў губернскі г. Мінск, у якім функцыянавала 50 сярэдніх і ніжэйшых адукацыйных установ, працавала 299 настаўнікаў і навучалася 8 351 вучняў [ 7, с. 265-267 ]. У 1910 г. колькасць такіх навучальных установ узрасла больш, чым у 3 разы і ў гарадах беларускіх губерняў было заасяроджана 626 ніжэйшых і 111 сярэдніх навучальных установ [ 7, с. 282 ]. Менавіта ў гарадах, дзе былі заасяроджаны навуковыя цэнтры, навучальныя ўстановы, выдавецтвы, рэдакцыі газет і часопісаў, тэатры, музеі, бібліятэкі і інш. культурна-асветніцкія ўстановы, канцэнтравалася найбольш адукаваная і дэмакратычная частка інтэлігенцыі.

Рост агульнай колькасці інтэлігенцыі Беларусі і паступовае заасяроджванне яе навукова-інтэлектуальнага і культурна-асветніцкага патэнцыялу у беларускіх гарадах, рабілі яе ўплывовым фактарам культурна-духоўнага развіцця не толькі беларускіх гарадоў, але і ўсяго краю і сталі падмуркам для нацыянальнага аддраджэння беларускага народа і фарміравання беларускай нацыі.

*Літаратура*


1. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года / Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел ; под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб., 1904. – Т. 4 : Виленская губ., тетрадь 3 ( последняя ). – 179 с.
2. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 года / Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел ; под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб., 1903. – Т.5: Витебская губ., тетрадь 3 ( последняя ). – 282 с.
3. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 года / Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел ; под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб., 1904. – Т.11: Гродненская губерния. – 319 с.
4. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 года / Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел ; под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб., 1904. – Т. 22 : Минская губерния. – 241 с.
5. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 года / Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел ; под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб., 1903. – Т.23 : Могилёвская губерния. – 275 с.
6. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі : у 4-х т. / Н. М. Нікольскі [ і інш.]; пад рэд. Н. М. Нікольскага. – Мінск: Акад. Навук БССР, 1936 –
7. 1954. – Т.2. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі ( 1772 – 1903 гг.).
8. / Н. М. Нікольскі [ і інш.]; пад рэд. Н. М. Нікольскага. – 1940. – 938с.
9. Документы и материалы по истории Белоруссии: в 4 т./ В. Н. Перцев [и др. ]; под ред. В. Н. Перцева. – Минск: Акад. Наук БССР, 1936 – 1954. – Т. 3: Документы и материалы по истории Белоруссии ( 1900-1917 гг.) / В. Н. Перцев [ и др.]; под ред. В. Н. Перцева. – 1953. – 1018 с.
10. Баградовіч, А. І. Навуковая і культурна – асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі ў Беларусі (ў 1861-1900 гг.)./ А. І. Баградовіч. – Мінск: БДПУ, 2003. – 23 с.
11. Шыбека, З.В. Гарады Беларусі ( 60-я гады ХІХ – пачатак ХХ стагоддзяў ) /
12. З. В. Шыбека. – Мінск: ЭўроФорум, 1997. – 292 с.
13 Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк ( гал. рэд.) [ і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000-2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі
14. ( канец XVIII – пачатак ХХ ст.) / М. Біч [ і інш.]. - 2005. – 519 с.
15. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2-х ч./ рэдкал.: М. П. Касцюк ( гал. рэд.) [ і інш.]. – Мінск: Беларусь, 1994 – 1995. – Ч. 1: Нарысы гісторыі Беларусі / М. Касцюк
16. [ і інш. ]; пад рэд. М. П. Касцюка. – 1994. – 527 с.
17. Александровіч, С. Х. Гісторыя і сучаснасць: літ.-крыт. артыкулы. Мінск: Беларусь , 1968. – 255 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ